З НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДАМ!

# Гомельскі універсітэт



ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 23 (810) | Панядзелак, 2 верасня 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.

*Пра ўступныя экзамены і першакурснікаў*

## ПЕРШЫ КРОК ДА ДЫПЛОМАЎ

Мінуў месяц пасля ўступных экзаменаў абітурыентаў у вышэйшыя навучальныя ўстановы. Улегліся хваляванні і перажыванні як саміх паступаючых, так і іх бацькоў. Для найбольш падрыхтаваных, за некаторым выключэннем, аб чым будзе сказана ніжэй, экзаменацыйныя выпрабаванні завяршыліся ўдачай. Яны атрымалі права набываць абраныя спецыяльнасці. І, думаецца, перад пачаткам новага навучальнага года многіх нашых чытачоў цікавіць, як сёлета складвалася конкурсная барацьба.

Флагман вышэйшай школы беларускага Палесся — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф. Скарыны. Тут і самы вялікі набор студэнтаў. Па плану на першы курс прадугледжвалася прыняць 950 чалавек — на 25 больш, чым у папярэднім годзе. Павелічэнне звязана з адкрыццём новай спецыяльнасці — правазнаўства.

Паступіць у ГДУ мелі жаданне 2049 юнакоў і дзяўчат. Калі ўлічыць 43 слухачы падрыхтоўчага аддзялення, якія паспяхова здалі выпускныя экзамены і былі залічаны на першы курс універсітэта, на кожнае з астатніх 907 месц прыпадала па 2,26 абітурыента. Гэта на 0,1 больш леташняга. Самы высокі конкурс — 3,9 чалавек на месца — склаўся на факультэце фізічнай культуры. Па 3 прэтэндэнты на месца было на спецыяльнасць «Бухгалтарскі ўлік, кантроль і аналіз гаспадарчай дзейнасці», 2,7 — на «Эканоміка і сацыялогія працы», па 2,6 — на спецыяльнасці правазнаўства, гісторыя, геаграфія, 2,4 — на рускую мову і літаратуру, 2,3 — на спецыяльнасць «Праграмнае забеспячэнне вылічальнай тэхнікі і аўтаматызаваных сістэм». Неабходна адзначыць, што за апошнія гады значна ўзрос аўтарытэт геалагічнага факультэта, сведчаннем чаго з'яўляецца прыкметнае павышэнне конкурсу.

Здзіўленне выклікала сітуацыя, якая склалася пры паступленні на педагагічнае аддзяленне фізічнага факультэта. На 50 месц заявы падалі ўсяго толькі 46 абітурыентаў. Адсюль можна зразумець, якія да іх прад'яўляліся патрабаванні. З экзаменамі не справіўся адзін (?!) чалавек. Для астатніх хапіла шасці балаў, каб стаць першакурснікамі. Ужо цяпер у некаторай ступені можна меркаваць, якімі студэнтамі, а ў будучым і фізікамі-выкладчыкамі, стануць круглыя троечнікі.

Сёлета ўступныя экзамены ва універсітэт мелі адну характэрную асаблівасць. Конкурс праводзіўся як на асобныя спецыяльнасці, так і на спецыялізацыі. Наколькі апраўдана апошняе, пакажа час.

Для многіх абітурыентаў уступныя экзамены ў ГДУ пачаліся ў канцы мая. Права датэрмінова здаваць іх атрымалі найбольш падрыхтаваныя слухачы падрыхтоўчых курсаў, асобы, якія мелі індывідуальныя дагаворы па накіраванню прадпрыемстваў і арганізацый з іх абавязацельствамі частковай кампенсацыі расходаў на падрыхтоўку спецыялістаў. Усім паступіўшым (за выключэннем філалагічнага факультэта) прадстаўлялася магчымасць датэрмінова пісаць сачыненне і яе выкарыстала значная колькасць абітурыентаў. Пасля датэрміновай здачы ва універсітэце некаторых уступных экзаменаў атрыманыя адзнакі залічваліся абітурыентам і як выпускныя ў школе. І наадварот, для некаторых паступаючых на фізічны факультэт выпускны экзамен па

(Заканчэнне на 2-й стар.).



Дзе ж ён, той самы шчаслівы білет?



Аксана Клімовіч шчаслівага білета не шукала. Да экзамена па гісторыі яна была падрыхтавана грунтоўна. І экзаменатары ацанілі яе веды на «выдатна». Дзяўчына паступіла ва універсітэт на спецыяльнасць «Правазнаўства».

Фота У. Чысціка.

## АЛЕНА РУДКОЎСКАЯ— ЧЭМПІЁНКА ЕЎРОПЫ

У сёлетнім сезоне радуе прыхільнікаў спорту сваімі выступленнямі на блакітных дарожках другакурсніца факультэта фізічнай культуры нашага універсітэта майстар спорту міжнароднага класа Алена Рудкоўская. Яна неаднаразова выходзіла пераможцай і станавілася прызёрам не толькі ўсесаюзных, але і міжнародных спаборніцтваў, займае адно з вядучых месц у аспрэчванні Кубка свету па плаванні.

Новага выдатнага поспеху Алена дасягнула на чэмпіянаце Еўропы па водных відах спорту, які праходзіў у сталіцы Грэцыі — Афінах. У фінальным заплыве брасам на дыстанцыі 200 м наша спартсменка здолела апярэдзіць усіх сваіх моцных сапернiц і з вынікам 2.29,5 сек. заваявала вышэйшую ўзнагароду чэмпіянату.

У наступныя дні чэмпіянату Алена заваявала яшчэ дзве залатыя ўзнагароды — на дыстанцыі 100 м брасам і ў камбінаванай эстафеце 4×100 м.

## НА ЎСІХ ІНТЭРНАТАЎ НЕ ХОПІЦЬ

Да нядаўняга часу ўсімі пытаннямі, звязанымі з інтэрнатамі, займаўся прафком студэнтаў універсітэта. Цяпер жа ў ГДУ пачаў дзейнічаць спецыяльна створаны аддзел па рабоце ў інтэрнатах, які падпарадкоўваецца прарэктару па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях. Узначаліў яго Вячаслаў Гапееў, які да гэтага працаваў у камітэце ЛКСМБ універсітэта.

У функцыі аддзела ўваходзіць засяленне, кантроль за пражываннем, арганізацыя культурна-выхаваўчай работы ў інтэрнатах, якіх у нас ва універсітэце чатыры. Разлічаны яны на 2052 месцы.

Натуральна, што парадак атрымання месца ў інтэрнаце хвалюе перш за ўсё першакурснікаў, якія прыехалі на вучобу ў Гомельскі дзяржуніверсітэт з розных месц вобласці, рэспублікі, краіны. Сёлета для іх выдзелена ў інтэрнатах 180 месц. Такім чынам, ад маючых патрэбу ў жыллі студэнтаў-першакурснікаў яго атрымаюць прыкладна 50%. Астатнім давядзецца шукаць жыллё на прыватных кватэрах. У першую чаргу месцамі ў інтэрнатах забяспечваюцца юнакі і дзяўчаты, якія не маюць аднаго з бацькоў, сіраты, са шматдзетных сем'яў.

Па ўсіх пытаннях, звязаных з інтэрнатамі, трэба звяртацца ў п. 1-8 галоўнага корпуса, тэл. 57-81-11.

## ВІНШУЕМ!

**У канцы чэрвеня г. г., калі, у сувязі з пачаткам студэнцкіх летніх канікулаў, наша газета ўжо не выходзіла, дацэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства КАЗЛОВА Раіса Міхайлаўна паспяхова абараніла дысертацыю на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты філалагічнага факультэта горача віншуюць яе з гэтай знамянальнай падзеяй і жадаюць новых дасягненняў у навуковай дзейнасці і на ніве падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.**



Кожны дзень, калі выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты ідуць ва універсітэцкія карпусы, што па вул. Савецкай, на працу, на заняткі, усё навокал здаецца ім знаёмым, прывычным, не прыцягваючым увагу. Такая ўжо асаблівасць чалавечага зроку — тое, што бачыш штодня, перастаеш заўважаць. Мы больш за ўсё заклапочаны цяпер сваімі праблемамі, якіх з кожным днём жыццё падкідвае нам усё больш і больш, становімся ад гэтага ўнутрана заняволенымі, закамплексаванымі і дзе ўжо там нам да навакольнай прыгажосці: квітнеючага ў маі дрэва ці жоўта-барвовых плям на восеньскай яго кроне?

Вось такім прывычным стала для нас і зялёнае ўбранне дрэў, кустоў, клумб па шляху ад галоўнага да першага корпуса, ва універсітэцкім скверы. І мала хто з нас ведае, што тут ёсць прадстаўнікі флоры з самых розных краін свету, што створана ўся гэта прыгажосць, дзякуючы старанням калектыву біялагічнага факультэта нашага універсітэта.

Запавольце крок каля канадскага клёна ці вечназялёнай прыгажуні-ёлкі, кветак на клумбах. Прыглядзьцеся. І вы адчуеце іх гаючую сілу на ваш настрой.

Нам хочацца, каб вы зірнулі на прыроду, што нас акаляе штодзённа, іншымі вачыма, больш падрабязна даведаліся аб цікавых раслінах, што **растуць тут.** На старонках нашай газеты мы змесцім публікацыі на гэту тэму, якія падрыхтуюць выкладчыкі біялагічнага факультэта.

Фота **У. Чысціка.**

*Табе, першакурснік!*

## РАЗВІВАЙЦЕ СВАЕ ТАЛЕНТЫ

Папаўненне студэнцкай сям'і універсітэта — першакурснікі, безумоўна, валодаюць самымі разнастайнымі талентамі. Развіваць іх за гады вучобы яны змогуць у шматлікіх творчых калектывах клуба мастацкай самадзейнасці «Маладосць». Кожны можа выбраць яго на свой густ.

Дарагія першакурснікі! Вас чакаюць:

народны студэнцкі тэатр «Люстэрка»;

народны ансамбль танца «Радзімічы»;

харавая капэла «Дзянніца»;

студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр;

агітбрыгада;

фальклорны ансамбль;

калектыў індывідуальных выканаўцаў;

ансамбль камернай музыкі «Дывертысмент»;

ансамбль «Алегра».

Жадаючыя запісацца ў названыя калектывы могуць пазваніць нам па тэл. 57-33-30.

**Клуб мастацкай самадзейнасці ГДУ.**

*Вясёлы перапынак*

## МАЛАЯ СТУДЭНЦКАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

● **Буфет** — найбольш часта наведваемая студэнцкая аўдыторыя.

● **Варварства** — мастацкая разьба і пісанне на сталах і стулах, сценах, падаконніках і інш.

* * *

**Велікадушнасць** — рыса характару, якая лепш за ўсё ўвасабляецца ў старасце групы, які скрывае прагульшчыка.

* * *

**Вада** — форма матэрыі, без якой не могуць быць поўнымі адказы студэнтаў на экзаменах.

* * *

**Геній** — студэнт, які вывучыў усю дадатковую літаратуру.

* * *

**Гітара** — раней — музычны інструмент, зараз — турысцкі інвентар.

* * *

**Грошы** — тое, што засталося ад стыпендыі пасля вяртання даўгоў.

* * *

**Дэкан і вучэбна-акадэмічная камісія** — Алі-Баба і 40 разбойнікаў.

* * *

**Джаз** — музычны калектыў, гульню якога лёгка імітуюць галодныя ваўкі.

* * *

**Жалезабетон** — гэта асаблівы сплаў: жалеза расплаўляецца, а потым туды сыплюць бетон, і ўсё добра перамешваецца.

* * *

**Ахвяра** — студэнт, які не змог у час экзамена падмануць выкладчыка.

(**«Студенческий меридиан», № 5 за 1991 г.**).


**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантнай пасады загадчыка кафедры эканомікі і кіравання вытворчасцю.

Тэрмін падачы заяў — 1 месяц з дня апублікавання паведамлення аб яго правядзенні.

Дакументы і заявы накіроўваць на адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104.

**Рэктарат.**


*Да адкрыцця юбілейнага цыркавога сезона*

# КАЛЕЙДАСКОП ЗОРАК

4 верасня Гомельскі дзяржцырк адкрывае свой чарговы — 20-ы сезон. Усе гэтыя гады цырк радуе гамяльчан і гасцей нашага горада сваімі маляўнічымі прадстаўленнямі. І гэта не здзіўляльна! Таму што на нашым манежы выступалі народныя артысты СССР Карандаш, Уладзімір Валжанскі, Уладзімір Аскал-Аол, Уладзімір Шаўчэнка, народныя артысты РСФСР Тэрэза Дурава, Юрый Куклачоў, Ірбек Канцеміраў, Андрэй Нікалаеў, Ілья Сімвалокаў, Вальтэр Запашны, Уладзімір Давейка, заслужаныя артысты рэспублікі Ігар Кіо, Атар Рацiані, Эміль Кіо, Мікалай Паўленка, Барыс Бірукоў, Аляксандр Папоў, Аляксандр Родзін і многія-многія іншыя вядомыя майстры савецкага цырка.

Вось і ў праграме «Але-ап!», якую мы запрасілі адкрыць юбілейны цыркавы сезон, прымуць удзел прадстаўнікі слаўнай плеяды лепшых артыстаў цырка.

...Пад бравурную музыку на манеж віхрам вылятаюць коннікі. Здзіўляе спрытнасць, сіла і ўдаль джыгітаў, вынослівасць і шпаркасць коней. Тыя, хто добра ведае конны цырк, адзначаюць незвычайна высокі тэмп, у якім коні ідуць па колу, а ў гэты час джыгіты дэманструюць складаныя трукі. На поўным скаку джыгіт быццам падае з сядла, завісае на адной назе, рукі яго кранаюцца манежа (гэты трук называецца «абрыў»). Энергічнае намаганне — і наезнік зноў на кані! Або коннік саслізгвае з сядла і праз некалькі секунд артыст быццам выныравае з-пад каня з другога боку і спрытна падымаецца ў сядло. Усё ўзрастае тэмп, ускладняюцца трукі. Прычым, джыгітоўка — гэта адно з многіх відовішчаў, якія прадстаўляе на манежы конна-акрабатычны атракцыён «Рэха Азіі». Ім кіруе народны артыст СССР Даўлет Хаджабаеў. Атракцыён шмат разоў прадстаўляў савецкае цыркавое мастацтва ў іншых краінах. Югаславія, Італія, Фінляндыя, Бельгія, Францыя, Паўднёвая Амерыка, Канада, Турцыя — частка маршрута гастроляў артыстаў за мяжой. Замежных гледачоў таксама, як і нас, прыцягвае ў выступленнях атракцыёна нацыянальная своеасаблівасць, шпаркі рытм, адвага і ўдаль артыстаў. У ЗША гастролі прайшлі з трыумфальным поспехам, аб чым сведчыць адно з выказванняў амерыканскага друку: «Гэтая група наезнікаў заткне за пояс самых геройскіх галівудскіх каўбойскіх зорак...».

...Павольна гасне святло і раптам на манеж выязджае вялікая ладдзя з чатырма багатырамі. Нібыта ажываюць малюнкі гераічнага мінулага Русі — былінныя багатыры сваімі эфектнымі позамі сцвярджаюць непахісны дух рускіх воінаў, якія гатовы ў любую мінуту абараніць сваю Айчыну ад ворагаў. Так, мастацка-акрабатычная група пад кіраўніцтвам Бабкена Марцірасяна выражальнымі сродкамі паказвае магчымасць і здольнасць цырка ўвасабляць на манежы цікавейшыя задумкі.

Францыя, Чэха-Славакія, Германія, Румынія, Індыя, Японія, ЗША, Галандыя, Аўстралія — амаль на ўсіх кантынентах выступаў лаўрэат Сусветнага конкурсу цыркавога мастацтва ў Монтэ-Карла атракцыён «Акрабаты на рускіх арэлях з мядзведзямі» пад кіраўніцтвам Юрыя Савіна. Гэты ўнікальны ансамбль настварыў у 1969 годзе народны артыст РСФСР Бенедзікт Беляюў. Атракцыён напоўнены эфектнымі трукамі, у якіх разам з артыстамі прымае паўнапраўны ўдзел група дрэсіраваных мядзведзяў; яны танцуюць, выконваюць трукі на падкідной дошцы, прыносяць і ўносяць рэквізіт. Вельмі дакладная характарыстыка гэтаму атракцыёну дадзена ў назве аднаго з артыкулаў у друку: «Непракладзеным шляхам». Папулярнасць у свеце цырка забяспечыла атракцыёну добрую рэкламу. У выніку — пасля выступленняў у г. Гомелі артысты адпраўляюцца на працяглыя гастролі за мяжу.

Акрамя дрэсіраваных мядзведзяў, мы ўпэўнены, з вялікай радасцю, і ў асноўным дзеці, успрымуць дрэсіраваных малпаў, з якімі выступяць артысты Ван-юлі. Смех, радасць, вяселле — адметныя рысы залы ў час «працы» гэтага нумара.

Паветраны жанр у праграме будзе прадстаўлены двума нумарамі: «Гімнасты на кольцах» пад кіраўніцтвам Мікалая Маркіна і «Паветраная гімнастыка на трапецыі» — Святлана Уцяшава.

Гледачы змогуць убачыць і вельмі арыгінальны вясёлы нумар «Камічныя жанглёры», які пакажуць Павел Кошаль і Віктар Кошман.

Мы спадзяемся, што ўсім спадабаецца нумар «Кітайскія гульні» у выкананні артыстаў Ван-шу-шань.

Адзіны ў цырку нумар «Дрэсіраваныя пеўні» Тацціяны Калабашкінай таксама, як і «Дрэсіраваныя сабачкі» Жаны Багатыровай, несумненна, спадабаюцца ўсім, хто іх убачыць. Гэта становіцца зразумелым, калі ўлічыць, што дрэсіраваны певень у нашым разуменні тое ж самае, што дрэсіраваны кракадзіл. Між іншым, чаго толькі не бывае на свеце. Тым больш, што гэта — цырк!

І, урэшце рэшт, клоуны — Ірына і Юрый Косінцавы. Характарыстыка ў двух словах — маладыя, смешныя. Іх візітнай карткай з'яўляецца нядаўняя праца ў новым Маскоўскім цырку на Ленінскіх гарах. А запрашэнне ў галоўны цырк краіны гаворыць само за сябе.

**Я. ЛАБОВІЧ,**
**дырэктар Гомельскага дзяржцырка.**


Рэдактар **Ул. БАЛОГА.**

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

«Гомельскі універсітэт» — газета Гомельского государственного университета им. Ф. Скорины, Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па друку, Гомель, Савецкая, 1.

Аб'ём — 1 друк. арк. Тыраж 1500 экз. Зак. 580. Падпісана да друку ў 14.00.